1Н// 304115
(039)

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

***Н.У. Чайка***

# ТЫПАЛОГІЯ ЭЛІПСІСА Ў СІНТАКСІЧНАЙ СІСТЭМЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Манаграфія*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск
2012

Нацыянальная
бібліятэка
Беларусі

## ЗМЕСТ

**Дадатак А. Кампаненты семантычнай структуры канструкцый з эліпсісам дзеяслова ... 3**

**Дадатак Б. Прадуктыўнасць мадэлей канструкцый з эліпсісам дзеяслова ... 9**

Б.1. Дынамічна-лакатыўны тып ... 10
Б.2. Экзістэнцыяльна-лакатыўны тып ... 22
Б.3. Акцыянальныя тыпы ... 26
Б.4. Лакатыўна-пацыентыўны тып ... 37
Б.5. Акцыянальна-дэлібератыўны тып ... 41
Б.6. Статальны тып ... 45
Б.7. Экзістэнцыяльна-тэмпаральны тып ... 47
Б.8. Рэляцыйны тып ... 49

**Дадатак В. Частотнасць структурных тыпаў канструкцый з эліпсісам дзеяслова ... 51**

В.1. Поліпрэдыкатыўны тып ... 52
В.2. Звышфразавы тып: самастойныя сінтаксічныя адзінкі ў структуры звышфразавага адзінства ... 63
В.3. Звышфразавы тып: эліптычныя і парцэляваныя канструкцыі ў структуры звышфразавага адзінства ... 76
В.4. Ускладнена-паратаксічны тып ... 84
В.5. Ускладнена-паўпрэдыкатыўны тып ... 89
*В.5.1. Эліптычныя канструкцыі з адасобленымі азначэннямі ... 89*
*В.5.2. Эліптычныя канструкцыі з адасобленымі акалічнасцямі ... 91*
В.6. Ускладнена-параўнальны тып ... 94
В.7. Ускладнена-далучальны тып ... 96
В.8. Ускладнена-паратаксічны тып ... 98
*В.8.1. Ускладнена-інтрадуктыўны тып (з устаўнымі канструкцыямі) ... 98*
*В.8.2. Ускладнена-інтрадуктыўны тып (са звароткамі) ... 101*

**Дадатак Г. Кампенсаторныя семантычныя кампаненты ў канструкцыях з эліпсісам дзеяслова ... 103**

Г.1. Дынамічна-лакатыўны тып ... 104
Г.2. Акцыянальныя тыпы ... 110
Г.3. Лакатыўна-пацыентыўны тып ... 120
Г.4. Акцыянальна-дэлібератыўны тып ... 122
Г.5. Экзістэнцыяльна-лакатыўны тып ... 125
Г.6. Статальны тып ... 128
Г.7. Экзістэнцыянальна-тэмпаральны тып ... 130
Г.8. Рэляцыйны тып ... 132

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Дадатак Д. Функцыянаванне канструкцый з эліпсісам дзеяслова .......... 134**
Д.1. Выражэнне прэдыкатыўных катэгорый у канструкцыях з эліпсісам дзеяслова .......... 135
*Д.1.1. Выражэнне катэгорыі тэмпаральнасці .......... 135*
*Д.1.2. Выражэнне катэгорыі мадальнасці .......... 142*
*Д.1.3. Выражэнне катэгорыі персанальнасці .......... 149*
Д.2. Канструкцыйная поліфункцыянальнасць сінтаксем у парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый .......... 155
*Д.2.1. Канструкцыйна-трансфармацыйныя фактары поліфункцыянальнасці сінтаксем .......... 155*
*Д.2.2. Канструкцыйна-катэгарыяльныя фактары поліфункцыянальнасці сінтаксем .......... 166*
*Д.2.3. Логіка-семантычныя фактары поліфункцыянальнасці сінтаксем .. 174*
**Дадатак Е. Акт аб укараненні .......... 177**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ДАДАТАК Б**

# Прадуктыўнасць мадэлей канструкцый з эліпсісам дзеяслова

У дадатку адлюстравана ступень прадуктыўнасці мадэлей канструкцый з эліпсісам дзеяслова на аснове рода-відавой класіфікацыі. Факталагічны матэрыял у ім сістэматызаваны з улікам тыпалагічнай характарыстыкі аб'екта. Кожны семантычны тып прадстаўлены ў асобным параграфе, напрыклад, Б.1 – *дынамічна-лакатыўны* тып. Далейшы падзел унутры кожнага тыпу ажыццяўляецца ў адпаведнасці з відавым класам, напрыклад, *рух аб'екта ад пачатковага пункта*. Пасля падаецца мадэль (адна або некалькі), што можа рэалізаваць семантыку адпаведнага віду, напрыклад, *агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт.* Затым адлюстравана колькасць структурных схем, якія рэпрэзентуюць семантычную мадэль (напрыклад, Pron $Pers_{nPlur}$ – ø – $N_{gPlur}$), і адпаведная ілюстрацыя. Пасля прыкладаў прадстаўлены колькасныя даныя, напрыклад, мадэль *агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт* рэалізуецца ў 9 структурных схемах.

***Умоўныя абазначэнні***

| **Часціны мовы** | **Склоны** | **Лікі** |
|---|---|---|
| N – назоўнік<br>Pron Pers – займеннік<br>Adv – прыслоўе<br>Adj – прыметнік<br>Ø – незамешчаная сінтаксічная пазіцыя | N – назоўны<br>G – родны<br>D – давальны<br>A – вінавальны<br>L – творны<br>I – месны | Sing – адзіночны<br>Plur – множны |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## *Б.1. ДЫНАМІЧНА-ЛАКАТЫЎНЫ ТЫП*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| Від | Мадэль | Структурная схема | Прыклады |
|---|---|---|---|
| Рух аб’екта ад пачатковага пункта | Агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт | Pron Pers$_{nSing}$ – ø – N$_{gSing}$ | *Кавылёк глядзеў, глядзеў, // Быццам вымавіць хацеў: – Ты – з падвала?*<br>*– Я – з Урала* (А. Пысін);<br>*– Я – з Мінска* (І. Мележ) |
| | | Pron Pers$_{nPlur}$ – ø – N$_{gSing}$ | *– Яны з Оршы, – кіўнуў на дзяўчат гаспадар* (А. Дзялендзік) |
| | | Pron Pers$_{nPlur}$ – ø – N$_{gPlur}$ | *– А мы, таварышы, з Сібіры* (А. Пысін);<br>*– Мы – з Куранёў* (І. Мележ) |
| | | Pron Pers$_{nSing}$ – ø – N$_{gPlur}$ | *– Я – з Баранавічаў, – адказаў нерашуча хлопец* (А. Бажко) |
| | | Pron Pers$_{nSing}$ – ø – Adv | *– Ты здалёку? – запытаў сусед і сеў побач* (В. Казько) |
| | | Pron Pers$_{nPlur}$ – ø – Adv | *– Адкуль вы?* (А. Куляшоў) |
| | | N$_{nSing}$ – ø – N$_{gSing}$ | *– А Віктар што – з вайны? – здзівілася Сцепаніда* (В. Быкаў) |
| | | N$_{nSing}$ – ø – N$_{gPlur}$ | *Хіба Таццяна з агледзін? – запытала маці і дадала: – Хутка вы* (Г. Багданава) |
| | | N$_{nPlur}$ – ø – N$_{gSing}$ | *Цягнікі з вакзала… Няспынна… І ўдзень і ноччу* (Янка Брыль) |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | ***9*** |
| Рух суб’екта да канечнага пункта | Агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш | Pron Pers$_{nSing}$ – ø – Adv | *– Куды, ты, Чаротны?* (А. Кулакоўскі);<br>*– Ты, Ігар, куды? – Па цукерку. Да дзеда* (А. Карпюк);<br>*– Куды ж ты, дачушка? Людзі на парог, а ты за парог?* (А. Кудравец);<br>*– Ты куды? – перапыніла яе мачыха* (І. Мележ) |
| | | Pron Pers$_{nPlur}$ – ø – Adv | *– Куды вы? Такія мясціны любяць злыя духі – джыны* (В. Іпатава) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| **Від** | **Мадэль** | **Структурная схема** | **Прыклады** |
|---|---|---|---|
| | | Pron Pers $_{d\ Sing}$ – ø – Adv | *– Табе куды? – запытаў вадзіцель ужо на хаду* (Б. Сачанка) |
| | | Pron Pers $_{d\ Plur}$ – ø – Adv | *– А вам далёка? – запытаў нас дзядзька* (Кузьма Чорны) |
| | | $N_{nSing}$ – ø – $N_{a\ Sing}$ – Pron Adj | *Галогоўскі – у горад свой родны. // Падгол – у любімы калгас* (П. Броўка) |
| | | $N_{n\ Plur}$– ø – $N_{a\ Sing}$ | *– Мужчыны – на завод, – адказаў шафёр* (І. Канановіч);<br>*– Хлопцы – у веску. Да дзеда Ягора* (Я. Сіпакоў) |
| | | $N_{nSing}$ – ø – $N_{a\ Plur}$ | *– А можа, цягнік – на Петраград?* (П. Глебка);<br>*– Вольга ў Баранавічы. На практыку* («Звязда») |
| | | $N_{nPlur}$ – ø – $N_{aPlur}$ | *Калгаснікі ў Плюсы. На працу* («Браслаўская звязда») |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | ***8*** |
| Рух суб'екта ад пачатковага пункта да канечнага | Агенс (імпл.) – прэдыкат – дырэктыў-старт – дырэктыў-фініш | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – Pron $Pers_{nSing}$ – $N_{aSing}$ | *– А я з гасцей ды ў госці, – пачала Марыля не дужа гнуткім языком* (І. Чыгрынаў);<br>*– Я ад цябе – да маці* (К. Кірэенка) |
| | | Pron $Pers_{nPlur}$ – ø – Pron $Pers_{Sing}$ – $N_{aSing}$ | *Дзеці з дому – на рэчку* (С. Баранавых) |
| | | Pron $Pers_{nPlur}$ – ø – Pron $Pers_{Plur}$ – $N_{aSing}$ | *– Мы ад іх да бацькі* (Б. Сачанка) |
| | | Pron $Pers_{nPlur}$ – ø – $N_{gSing}$ – $N_{aSing}$ – Adj – Adj | *Мы з начы глухой – у вечны свой світанак* (Р. Баравікова) |
| | | $N_{nSing}$ – ø – $N_{gSing}$ – $N_{aSing}$ – Adj | *Прабег шарак, узняўшы хруст, // Прачнуўшыся ад сну. // Птушыны піск – з куста на куст. // Бы спудзіў хто жаўну* (П. Броўка) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Працяг табліцы*

| Від | Мадэль | Структурная схема | Прыклады |
|---|---|---|---|
| | | $N_{nPlur}$ – ø – $N_{gSing}$ – $N_{aSing}$ | *І пачалося: – Майна! Віра! З паверха на паверх // Сустрэчны рух і бег…* (Э. Валасевіч),<br>*Дзяўчаты з лесу – у поле* (П. Броўка) |
| | | $N_{nPlur}$ – ø – $N_{gPlur}$ – $N_{i}$ – $Adj_{nSing}$ – $Adj_{gPlur}$ | *Маладыя людзі ад родных ніў – па франтах* («Звязда») |
| | | $N_{nSing}$ – ø – Adv – $N_{aSing}$ | *Міхась служыў у арміі. Адтуль хлопец – у горад. Вяртацца назад не стаў* (Л. Леванові ч) |
| | | $N_{nPlur}$ – ø – $N_{gPlur}$ – Adv – $N_{gSing}$ | *Вогнішча ўбачылі яшчэ на золаку. Усе людзі з хат – туды, да пажарышча* (А. Бялевіч) |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | ***9*** |
| Рух суб'екта ў канкрэтным напрамку без указання на пачатковы або канечны пункт | Агенс – прэдыкат – транзітыў | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – Pron $Pers_{lSing}$ | *– А ты – за мной. Па маіх слядах трымай. Тут нямнога ўжо, – сказаў зводдаль Рыбак* (В. Быкаў) |
| | | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – Pron $Pers_{lPlur}$ | *– Я – услед за імі. Спыніўся каля зямлянкі і чую: камандзір паклікаў* (В. Быкаў) |
| | | Pron $Pers_{nPlur}$ – ø – Pron $Pers_{lPlur}$ | *– Мы – услед за імі. Да самай хаты. Там нас сустрэла цётка, запрасіла зайсці* (А. Бачыла) |
| | | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – Adv | *– Пабачышся з сёстрамі і адразу вяртайся назад. А я – насустрач. Буду чакаць на ўзлеску* (У. Корбан) |
| | | Pron $Pers_{nPlur}$ – ø – Adv | *Міхал падвядзе людзей да вёскі. А мы – насустрач* (І. Кананові ч) |
| | | $N_{nSing}$ – ø – Adv | *Насустрач войска, // Пыльныя пілоткі. // Гарматы. // Танкі. //* |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| **Від** | **Мадэль** | **Структурная схема** | **Прыклады** |
|---|---|---|---|
| | | | *Пыльныя ствалы* (А. Пысін);<br>*Папераддзе – Тайдо, ззаду – Кос* (Я. Маўр);<br>*Дарога полем, // Блізка лес. // Насустрач – афіцэр СС* (П. Броўка) |
| | | $N_{nPlur}$ – ø – Adv – $N_{lSing}$ | *Наступны ўзмах – і воля. // Насустрач – сінню! – акіян* (Т. Бондар) |
| | | $N_{nSing}$ – ø – $N_{iSing}$ | *Над згадкай ціша сышлася. – І зноў вятрыска калыша сцяну хмызнякоў. // Бяда ж – за дзяўчынкай. Каторы ўжо круг* (Т. Бондар) |
| | | $N_{nSing}$ – ø – $N_{iPlur}$ | *І Алёшка, //Мірон, // І Зянон – // Па карчах, // Па кустах наўздагон* (А. Пысін);<br>*Насустрач прыгодам…. З інструктарам і ўрачом* («Настаўніцкая газета») |
| | | $N_{nPlur}$ – ø – $N_{iPlur}$ | *Малыя – за дарослымі. І ў поле, і ў лес, і на рэчку* (Л. Калюга) |
| | | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – $N_{aSing}$ | *– Я пайду дарогай. А ты – праз лес. Сустрэнемся ў Хведара* (В. Быкаў) |
| | | Pron $Pers_{nPlur}$ – ø – $N_{aSing}$ | *– Па дарозе нельга. Пасты. Мы – цераз хмызняк. У Смалярні нас ужо чакаюць* (В. Быкаў) |
| | | Pron $Pers_{nPlur}$ – ø – $N_{aPlur}$ | *Самая вялікая праблема – культурны ўзровень жыхароў Гродна. У нас вялікая колькасць дарожак і сцежак. І пры гэтым усе – праз газоны і клумбы. Хоць ты загародку пастаў* («Звязда») |
| | | $N_{nSing}$ – ø – $N_{aSing}$ | *Ісці па вуліцы не хацелася. Там заўсёды людна. І Міхась – праз гароды, збіваючы нагамі халодную начную расу* (В. Хомчанка) |

*Працяг табліцы*

| Від | Мадэль | Структурная схема | Прыклады |
|---|---|---|---|
| | | $N_{nSing}$ – ø – $N_{aPlur}$ | *Стаміўшыся ад бессэнсоўнага начнога блукання, ад холаду і снегу, Іван – праз нейкія насыпы і пагурынкі. Ён хацеў трапіць у Журоўку, у тую крайнюю хату, дзе было так цёпла і ўтульна* (М. Капыловіч) |
| | | $N_{nPlur}$ – ø – $N_{aSing}$ | *Пасля ўжо іх перавялі ў мястэчка. Пакідаючы вёску, Раман бачыў: праз чыгунку – салдаты. Няспынна і бясконца* («Мінская праўда») |
| | | $N_{nPlur}$ – ø – $N_{aPlur}$ | *– Мы знаходзіліся на левым флангу групоўкі, якая наступала на Берлін. Там наша дывізія трапіла ў акружэнне. Было загадана выходзіць. Здарылася арыгінальная сустрэча. З акопаў – нашы салдаты (а трэба было выбірацца)* («Звязда») |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | ***17*** |
| Мэта руху | Агенс – прэдыкат – фінітыў-1 | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – $N_{iSing}$ | *– Так, так няможна! Род звядзецца, // Калі магіл не шанаваць… // Стары падняў з травы вядзерца: // – А я во – з хварбай, маляваць* (Н. Гілевіч);<br>*– Я – па справе* (А. Дудараў)<br>*– З чым яны на гэты раз* (А. Петрашкевіч) |
| | | Pron $Pers_{nPlur}$ – ø – $N_{iSing}$ | *– Мы – па справе. Да старшыні* (І. Мележ);<br>*– Я… на прыём. Да цябе* (І. Шамякін) |
| | | $N_{nSing}$ – ø – $N_{iSing}$ | *Перш за ўсё па распарадку – // У садочак на зарадку* (А. Пысін); |
| | | $N_{nPlur}$ – ø – $N_{iPlur}$ | *Педагагічны савет закончыўся. Усе настаўнікі – па справах. Некаторым трэба было праводзіць класныя гадзіны (а было гэ-* |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| Від | Мадэль | Структурная схема | Прыклады |
|---|---|---|---|
| | | | *та ў чацвер), у некаторых былі факультатывы і гурткі* («Настаўніцкая газета») |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | ***4*** |
| Дзеянне як мэта руху | Агенс – прэдыкат – фінітыў-4 | Pron Pers$_{nSing}$ – ø – N$_{aSing}$ | *Уваходзіць Таіса Зязюля. – Па грыбы, па арэхі?* (А. Дзялендзік); *– Я на паляванне, – сказаў Франц Леанідавіч і дадаў: – Давайце са мной* («Браслаўская звязда») |
| | | Pron Pers$_{nPlur}$ – ø – N$_{aSing}$ | *– Мы – на паляванне, – адказаў егер нацпарка. – На ціхае. У грыбы* («Браслаўская звязда») |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | ***2*** |
| Рух суб'екта, суадносны з працягласцю | Агенс – прэдыкат – дыменсіў-1 | Pron Pers$_{dPlur}$ – ø – Adv | *– А вам далёка* (В. Быкаў) |
| | | Pron Pers$_{nPlur}$ – ø – Adv | *– Вы – далёка* (М. Капыловіч) |
| | | Pron Pers$_{nSing}$ – ø – Adv | *– Ты – далёка* (В. Казько) |
| | | Pron Pers$_{dSing}$ – ø – Adv | *– Табе далёка, – перапыніў Ганну Міканор* (І. Мележ) |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | ***4*** |
| Рух суб'екта, суадносны са спосабам | Агенс – прэдыкат – дыменсіў-3 | Pron Pers$_{nSing}$ – ø – Adv | *– Я – мігам. На адной назе* (А. Макаёнак) |
| | | Pron Pers$_{nPlur}$ – ø – Adv | *– Мы хутка. Ты пасядзі тут, – сказаў ён Цімошкіну* (В. Быкаў) |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | ***2*** |
| | Агенс – прэдыкат – | Pron Pers$_{nSing}$ – ø – N$_{aSing}$ | *– Ты пабудзь. А я – на хвілінку* (В. Быкаў) |
| | | N$_{nSing}$ – ø – Adv | *Мікалай паспрабаваў злавіць папутку. Але ні адна машына не* |

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*Працяг табліцы*

| Від | Мадэль | Структурная схема | Прыклады |
|---|---|---|---|
| | медыятыў-1 | | *спынялася. І хлопец – пехатой. Ён ведаў, што вёска не вельмі далёка і што хутка будзе дома* (А. Кулакоўскі) |
| | | $N_{nPlur}$ – ø – Adv | *А немцы, немцы – сургучнём. Ён палівае іх агнём* (П. Броўка); *А шнур (жураўоў) парваны – нізам, нізам...* (А. Пысін); *Выйшлі яны пагуляць. А насустрач жанчына з каляскаю* (Г. Багданава); *– Ты не на матацыкле? – спытаў Валера, скіроўваючы думкі Ігната ці іншае* (А. Кудравец) |
| | | Pron $Adj_{nPlur}$ – ø – Adv | *Птушкі над вёскай – чародкамі* (Т. Бондар) |
| | | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – Adv | *– Я – пехатой, – узрадаваўся ён, што гэтая вуліца была не так далёка, як яму здавалася спачатку* (В. Быкаў) |
| | | Pron $Pers_{nPlur}$ – ø – $N_{nI}$ | *– Мы – градою, узмежкам, – падказаў нехта* (Т. Бондар) |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | ***6*** |
| | Агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – медыятыў-1 | $N_{nSing}$ – ø – Adv – $N_{aSing}$ – $Adj_{nSing}$ – $N_{gSing}$ | *І раптам лёгкі цень – на велічнасць уцёса* (Р. Баравікова) |
| | | $N_{nPlur}$ – ø – Adv – $N_{aSing}$ | *– Хлопцы! Хутчэй – на завод* (А. Дзялендзік) |
| | | Pron Pers – ø – Adv – $N_{aSing}$ – $Adj_{aSing}$ | *Птушка патрывожаная свішча, // І настылі з раніцы кусты. // Я хутчэй – на ціхае гарышча, // Дзе схаваны даўнія лісты* (Р. Баравікова) |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | ***3*** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Працяг табліцы*

| Від | Мадэль | Структурная схема | Прыклады |
|---|---|---|---|
| Рух суб'екта, суадносны з прасторавым арыенцірам | Агенс – прэдыкат – транзітыў – медыятыў-1 | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – Adv – Pron $Pers_{aPlur}$ | *А ён гэтак рашуча проста на іх* (В. Быкаў) |
| | | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – Adv – $N_{gSing}$ – Pron $Pers_{Sing}$ | *Ярам-долам каля жыта, // Цераз лета, з-за ракіты – // Да цябе, хлапчына, напрасткі* (Г. Бураўкін)<br>*Праз цемру ценяў нацянькі – // Да зор, да неба* (М. Шабовіч) |
| | | $N_{nSing}$ – $Adj_{nSing}$ – $N_{gPlur}$ – ø – $N_{lSing}$ – $Adj_{lSing}$ | *Насустрач ім – такой знаёмай рыскай – // Гусей цяжкая хвалістая ніць* (Т. Бондар) |
| | | $N_{lPlur}$ – ø – $N_{aSing}$ – Pron Adj | *Ён глянуў, усё расце, буяе: агуркі па тапарышчу, памідоры па гарчыку. А праз гэту прыгажосць – гусеніцамі* (М. Матукоўскі) |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | ***4*** |
| Рух суб'екта, суадносны з зыходным пунктам | Агенс – прэдыкат – дырэктыў-старт – медыятыў-1 | $N_{nPlur}$ – ø – Adv – $N_{gPlur}$ – Pron Adj | *А міны скрозь з бакоў усіх* (П. Броўка) |
| | | $N_{nSing}$ – ø – $N_{lSing}$ – $N_{Plur\ i}$ – $Adj_{lSing}$ – $Adj_{Plur\ i}$ | *Гарачым агнём неспакойная кроў // Па пругкіх жылах* (А. Куляшоў) |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | **2** |
| Рух суб'екта, суадносны з умовамі | Агенс (імпл.) – прэдыкат – кандытыў – медыятыў | $N_{lSing}$ – $Adj_{lSing}$ – $N_{gPlur}$ – ø – Adv | *– Пётр Пятровіч... вы ў ботах на танцы?* (Г. Марчук);<br>*– Такім разводдзем немагчыма ні пешшу, ні на конях* (І. Мележ) |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | **1** |

*Працяг табліцы*

| Від | Мадэль | Структурная схема | Прыклады |
|---|---|---|---|
| Рух суб’екта, суадносны з тэмпараль- нымі харак- тарыстыкамі | Агенс – прэдыкат – фінітыў-4 – тэмпаратыў | Pron $N_{nSing}$ – ø – Adv – Adv | *– Хай хто-небудзь спачатку адзін. Як бы ў разведку. А пасля другі. Каб не абоім адразу* (В. Быкаў) |
| | Агенс (імпл.) – прэдыкат – ды- рэктыў-фініш – тэмпаратыў | $N_{aSing}$ – ø – Adv – Pron $Adj_{gPlur}$ | *У мір, да ўсіх – надоўга, на вякі* (Т. Бондар) |
| | | Adv – ø – $N_{gPlur}$ | *– Куды гэта проціў ночы* (І. Мележ) |
| | | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – $N_{aSing}$ – $N_{aSing}$ | *Яна – на ганак праз імгненне, // А там – на вулку наўздагон* (Н. Гілевіч) |
| | | Pron $Pers_{Sing}$ – ø – Adv | *– Я сёння – нікуды* (А. Макаёнак) |
| | | Pron $Pers_{Plur}$ – ø – Adv – $N_{aSing}$ – $Adj_{aSing}$ | *– А вы – надоўга ў родны дом?* (Н. Гілевіч) |
| | | Pron $Pers_{Plur}$ – ø – Adv – $N_{gPlur}$ | *– А вы надоўга да нас?* (В. Быкаў) |
| | | $N_{aSing}$ – ø – $N_{lSing}$ – Adv | *Прыбегла на пошту. Цёмна ў вачах. // У Мінск напісала некаль- кі слоў. // Пайшла тэлеграма па правадах. / /А Лена той хвіляю зноўку дамоў* (П. Броўка) |
| | | Pron $Persn_{Plur}$ – ø – Pron $Num_g$ + $N_g$ Plur – $N_{iSing}$ | *– Праз некалькі дзён мы – на Волзе* (А. Макаёнак) |
| | | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – Adv – $N_{gSing}$ | *– Дзед, а куды ты пасля вайны?* (А. Дудараў) |



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| Від | Мадэль | Структурная схема | Прыклады |
|---|---|---|---|
| | | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – Adv – $N_{aSing}$ – Pron $Adj_{aSing}$ | *Як дачуўся, што ты такую ўладу займеў, у тую ж хвіліну я – сюды* (А. Макаёнак) |
| | | Adv – $N_{n\ Sing}$ – ø – Adv – $N_{aSing}$ – $N_{iSing}$ | *Тады Войцік ураз апрытомнеў і, прыгнуўшыся, – за хвою, а пасля – па ўзлеску далей* (В. Быкаў) |
| | | Adv – ø – $N_{aSing}$ – $N_{lSing}$ | *Вось пераначуем, а заўтра ранічкай – у тыл* (В. Быкаў) |
| | | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – $N_{gSing}$ – (Num + $N_{gPlur}$) | *Будзе што паглядзець. // Ёсць нямала навін. // Я – з Чырвон-Гарадка, // Можа, сорак хвілін* (П. Броўка) |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | ***14*** |
| Рух суб'екта, суадносны з перыядычнасцю або паўтаральнасцю | Агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – дыстрыбутыў-2 | $N_{nPlur}$ – ø – Adv – Adv | *А думы ўгору – зноў і зноў* (П. Броўка) |
| Рух суб'екта, абумоўлены пэўнай прычынай | Агенс (імпл.) – прэдыкат – каўзатыў – дырэктыў-фініш | $N_{nSing}$ – ø – Adv – $N_{aSing}$ – $N_{gSing}$ | *Мікола чамусьці – у бок школы* (Г. Марчук) |
| | | $N_{nSing}$ – ø – $N_{iSing}$ – $N_{aSing}$ | *Хата была прыбрана. І Таццяна па звычаі – на вуліцу* (У. Шахавец) |
| | | $N_{gSing}$ – ø – $N_{gPlur}$ – $Adj_{gPlur}$ | *– Не аглядайся. // З радасці – да зор нябёсных* (Р. Баравікова) |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | ***4*** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Заканчэнне табліцы*

| Від | Мадэль | Структурная схема | Прыклады |
|---|---|---|---|
| | Агенс – прэдыкат – каўзатыў – дырэктыў-фініш – тэмпаратыў | $N_{nSing}$ – ø – Adv – $N_{aSing}$ – $N_{aSing}$ – Pron $Adj_{aSing}$ | *У тую ж хвіліну Сцяпан знячэўку – за парог* (А. Бачыла) |
| Рух суб’екта, суадносны з мэтай | Агенс – каагенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш | Pron $Pers_{nSing}$ – $N_{lSing}$ – ø – $N_{aPlur}$ – $N_{gPlur}$ | *– Ну, пакуль. // А я з парторгам // У брыгады да касцоў* (П. Броўка) |
| | Агенс – каагенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – тэмпаратыў | Pron $Pers_{nSing}$ – $N_{lSing}$ – ø – Adv – $N_{aSing}$ – Pron $Adj_{aSing}$ | *Дзень кожны я з стадам сюды – на балота* (З. Бядуля) |
| | Агенс – каагенс – прэдыкат – дыстрыбутыў-2 | Pron $Pers_{nSing}$ – ø – $N_{iPlur}$ – $N_{lSing}$ – Pron $Pers_{lPlur}$ | *– Ён жа ўсё па начах то з дзеўкай, то шчэ з кім!*<br>*– Яшчэ невядома, ты з кім* (І. Мележ) |
| | Агенс – прэдыкат – дырэктыў-фініш – дыстрыбутыў | $N_{nplur}$ – ø – Adv – $N_{nPlur}$ | *Нам пашчасціла абзавесціся добрым праважатым. І падарожжа мусіла выйсці за межы Вілейкі. Нашы студэнты – па вёсках і гарадах Вілейшчыны. З добрым расказчыкам гэта карысна ўдвая* («Шкаляр») |
| ***Усяго (у межах мадэлі)*** | | | **5** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ